***Маўленчая размінка.*** Пры чытанні ўрыўка з верша Пімена Панчанкі «Лясы і рэкі» правільна вымаўляйце гукі [г], [г’], [ц’], [ў], [р], [дз’], [ч], падвоены [ц].

Леглі плямы мазуту і нафты,
Бруд **сц**якае з усіх бако**ў**.
Як там птушкам пяе**цц**а?
Не надта. Як там **р**ыбы?
Спытай **р**ыбако**ў**.
Сме**рць** лясо**ў** для мяне неп**р**ымальна,
Як і **г**ібель павольная **р**эк...
Лю**дз**і, лю**дз**і, жыві**ц**е на**р**мальна
І п**р**а буду**ч**ы думай**ц**е век.

**Вадзяні́к** — у народных паданнях: уладар вадаёмаў і жывых істот у іх.
**Лесаві́к** — у народных паданнях: лясны дух, гаспадар лесу і звяроў.
**Сурага́т** — звычайна хімічнае рэчыва, якое замяняе натуральную вадкасць.
**Ро́спач** — стан, пачуццё крайняй безнадзейнасці, упадку духу.
**Кульга́ць** — ісці нясмела, ступаючы на карацейшую або балючую нагу.
**Ды́баць** *(разм.)* — ісці размерна і важна або нязграбна.
**Бляша́нка** — ёмістасць з тонкага ліставога жалеза.

***Пафантазіруйце.*** Разгледзьце малюнак на с. 72. Паразважайце, чаму такімі пакалечанымі выглядаюць Вадзянік і Лесавік.



Праваўладальнік Акадэмія адукацыі

## Вадзянік і Лесавік

*(Байка)*

*Уладзімір Правасуд*

Кульгаў па лесе Лесавік.
Ён ледзьве ды́баў да ракі́,
Каб паратунак там знайсці які.
Яму насустрач Вадзянік,
Што толькі выбраўся з вады.
— Скажы, браток, кіруешся куды? —
Ён запытаў Лесавіка.
— Іду туды, дзе плешчацца рака,
Як кажуць, у тваё ўлада́нні,
Каб там абмыць свае, браточак, ра́ны...
— Чакай, чакай, туды не лезь!
Я сам не задыхнуўся ледзь,
Мне не жыццё цяпер — бяда:
Уся забруджана вада...



— Як?! Чым забруджана? І шмат?
— Вунь бачыш там хімічны камбінат?
Ён дзень і ноч працуе і працуе,
Блакіт вады на бруднае фарбуе,
Усе ў раку шпурляе сурага́ты.
Цяпер я не блакітны — паласаты.
— Ой, гора нам, —
У роспачы прамовіў Лесавік. —
А ты ж куды падаўся, Вадзянік?
— Ды думаў да цябе — у лес...
— І да мяне, браток, не лезь:
Цяпер і мне няма дзе дзецца.
Аж разрываецца ад крыўды сэрца,
Куды ні глянь — разбітыя бутэлькі, шклянкі
Ды ад кансерваў розныя бляшанкі...
Няма куды ступіць нагой.
Куды падзецца ад бяды такой?!

1. Складзіце па змесце байкі некалькі пытанняў, якія б пачыналіся словамі *хто, чаму, дзе, як*. Задайце пытанні адзін аднаму і паслухайце адказы на іх.
2. Якія пачуцці выклікаюць у вас галоўныя героі байкі? Пацвердзіце сваю думку адпаведнымі радкамі.
3. Каго і за што байкапісец асуджае ў творы?
4. Што, на вашу думку, хацеў сказаць нам аўтар?
5. Разгледзьце ілюстрацыю да твора. Ці адпавядаюць яе настрой і фарбы зместу? Чаму?



Праваўладальнік Акадэмія адукацыі

6. Якія асаблівасці твора гавораць пра тое, што гэта байка? Выберыце 3 сцверджанні з прапанаваных:

а) персанажамі звычайна з'яўляюцца жывёлы або міфічныя героі;
б) твор мае звычайна павучальны характар;
в) часцей напісаны ў вершаванай форме;
г) твор прызначаны для пастаноўкі ў тэатры.

**Творчае заданне.** Падрыхтуйце выразнае чытанне байкі па ролях, папярэдне размеркаваўшы іх. Паспрабуйце праінсцэніраваць гэты твор.

Лес — наша агульнае багацце, і яго трэба берагчы. Лес не расце сам па сабе. Лясныя багацці неабходна аднаўляць. У нашай краіне створаны лясныя гадавальнікі, у якіх вырошчваюць саджанцы. Праз два гады іх перадаюць лесаводам для высадкі. Міне час, і сеянцы стануць высокімі моцнымі дрэвамі. Кожны з нас таксама можа прыняць удзел у акцыях па аднаўленні лясоў.



**Дзірва́н** — верхні слой глебы, густа зарослы травой; пласт, выразаны з гэтага слоя.
**Ве́тразь** — парус.

## А ты хоць дрэва пасадзіў?

*Пятрусь Броўка*



Дзе дваццаць год таму назад
Ляжаў дзірван акамянелы —
Расцвіў прыгожы, буйны сад,
Паплыў удаль, як ветразь белы...

Нямала тут вясновых дзён
Папрацавалі слаўна людзі,
Каб кожнай яблыняю ён
Усхваляваў нам сёння грудзі.



Ён так святло сваё разліў,
Глядзіш, нацешыцца няможна...
— А ты хоць дрэва пасадзіў? —
Няхай сябе спытае кожны.

?

1. Пра якую падзею з жыцця людзей вы даведаліся?
2. Дзякуючы каму з'явіўся на зарослым полі прыгожы сад?
3. З чым параўноўвае Пятрусь Броўка вясновы сад?
4. Растлумачце сэнс выразаў:
   а) Каб кожнай яблыняю ён
   Усхваляваў нам сёння грудзі;
   б) Ён так святло сваё разліў...
5. Раскрыйце асноўную думку твора.
6. Падрыхтуйце выразнае чытанне верша, захоўваючы адпаведныя паўзы і інтанацыю.



Праваўладальнік Акадэмія адукацыі